# *§ 53–0. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ
«ДЗЯРЖАВА ДАБРАБЫТУ»
КРАІНЫ «ТРЭЦЯГА СВЕТУ»
КРАІНЫ ГЛАБАЛЬНАГА ПОЎДНЯ
МАДЭРНІЗАЦЫЯ ІНТЭГРАЦЫЯ
НЕАКАНСЕРВАТЫЗМ

*Аслабленне пазіцый традыцыйных палітычных партый*

**1. Сучасная палітычная сістэма краін Захаду.** У 90-я гг. XX ст. у краінах Захаду слабне ўплыў неакансерватыўных партый. У Вялікабрытаніі да ўлады прыходзіць лейбарысцкая партыя, у Германіі — сацыял-дэмакратычная. Пры гэтым у заходніх дзяржавах назіралася значнае памяншэнне адрозненняў паміж рознымі партыямі ў ідэалогіі і палітыцы. Сацыял-дэмакратычныя партыі адмовіліся ад ідэі пабудовы дэмакратычнага сацыялізму і «дзяржавы дабрабыту». Іх прадстаўнікі лічылі неабходным развіваць рыначную эканоміку. Кансерватыўныя партыі прызналі важнасць хоць і абмежаванай, але падтрымкі бедных пластоў насельніцтва за кошт дзяржавы. Таму змена партый ва ўладзе не вяла да істотных змяненняў у палітыцы, якая праводзілася.

У выніку значная частка насельніцтва ўсё больш расчароўвалася ў традыцыйных партыях. Пашыралася перакананне, што дзяржавамі кіруе палітычная эліта, якая не звяртае ўвагі на інтарэсы простых грамадзян.

*Узмацненне пазіцый папулісцкіх партый*

У такой сітуацыі ўмацоўваліся пазіцыі новых партый, чыё кіраўніцтва не было звязанае з ранейшай палітычнай элітай. Іх пачалі называць несістэмнымі,

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Уздым папулярнасці папуліскіх палітыкаў у Еўропе выклікаў павелічэнне колькасці даследаванняў, прысвечаных гэтаму феномену. Асаблівая ўвага надавалася вызначэнню прыкмет папулізму. Вучоныя вылучылі наступныя:

1) папулісцкія рухі апелююць, як правіла, да народу і простых людзей;

2) папулісты выступаюць супраць палітычных сістэм і іх уладных эліт, нібы баронячы людзей ад улад, чыноўніцкага апарату, буйнога бізнесу;

3) выступаючы за моцную дзяржаву, здольную абараніць маленькага чалавека, папулісты жадаюць паменшыць прысутнасць дзяржавы ў жыцці грамадзян;

4) папулісцкія рухі ў большасці выпадкаў скіраваныя супраць інтэлектуалаў, хоць на чале саміх гэтых рухаў часцяком стаяць інтэлектуалы;

5) як правіла, у папулісцкім руху цэнтральную ролю адыгрывае харызматычны лідар;

6) папулісцкія рухі канцэнтруюцца на некалькіх спрэчных пытаннях жыцця грамадства і дзяржавы.

*1. Чаму папулісты, як правіла, звяртаюцца за падтрымкай да простага народу?*

*2. У чым выяўляецца супярэчлівасць пазіцый папулістаў?*

*3. Чым, на ваш погляд, абумоўлена ўзмацненне папулярнасці папулістаў напачатку XXI ст.?*

папулісцкімі. Цэнтральнае месца ў іх праграмах займалі барацьба супраць нелегальнай іміграцыі, усталяванне кантролю над буйны́мі кампаніямі, адмоўнае стаўленне да паскарэння інтэграцыйных працэсаў у Еўропе. У першыя дзесяцігоддзі XXI ст. папулісцкія партыі ў шэрагу заходніх краін (Францыя, Германія) атрымалі рэальную магчымасць далучыцца да барацьбы за ўладу.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія новыя палітычныя партыі з'явіліся ў краінах Захаду. Якія ідэі яны прапануюць, імкнучыся прыйсці да ўлады?

**2. Эканамічная сістэма краін Захаду на сучасным этапе. Крызіс «дзяржавы дабрабыту».** Сусветны эканамічны крызіс сярэдзіны 70-х гг. XX ст. выступіў адной з перадумоў крызісу мадэлі «дзяржавы дабрабыту». Шматлікія сацыяльныя праграмы, што рэалізоўваліся ў яе межах, патрабавалі вялікіх выдаткаў з дзяржаўнага бюджэту. Каб мець грошы на сацыяльныя праграмы, дзяржава павышала падаткі. Гэта падрывала зацікаўленасць

Крызіс «дзяржавы дабрабыту»

людзей эфектыўна працаваць для атрымання высокага заробку, бо значная яго частка ішла на падаткі. Многія выбіралі жыццё за кошт сацыяльных выплат дзяржавы. Ад высокіх падаткаў памяншаўся аб'ём грошай, якія прадпрымальнікі ўкладвалі ў развіццё эканомікі. Таму «дзяржава дабрабыту» сутыкнулася з крызісам. Працэс яе дэмантажу пачалі неакансерватары яшчэ ў 1980-я гг. У 1990-я гг. ад гэтай палітыкі адмовіліся і сацыял-дэмакраты.

Неакансерватыўныя партыі ў 1980–1990-я гг. ажыццявілі пераход да новай мадэлі эканамічнага развіцця.

**Неакансерватыўная мадэль эканомікі**

- Адмова ад актыўнага дзяржаўнага рэгулявання эканомікі
- Наданне максімальнай свабоды прыватнаму прадпрымальніцтву
- Істотнае скарачэнне выдаткаў на сацыяльныя праграмы, у тым ліку на атрыманне бясплатнай адукацыі і медыцынскай дапамогі

Кожны чалавек для забеспячэння свайго дабрабыту павінен быў спадзявацца на ўласную працу, а не на дапамогу дзяржавы. На дапамогу маглі разлічваць толькі тыя, хто з прычыны пагаршэння здароўя, старэчага ўзросту не мог дазволіць сабе годны ўзровень жыцця.

### Эканамічнае развіццё ў XXI ст.

Новая сацыяльна-эканамічная палітыка забяспечыла імклівы рост эканомікі заходніх дзяржаў у 80–90-я гг. XX ст. Аднак ад гэтага росту выйгралі ў асноўным заможныя колы насельніцтва, павялічыўся разрыў у даходах паміж найбагацейшымі і найбяднейшымі. Таму ў канцы XX — пачатку XXI ст. заходнія палітыкі сталі больш увагі звяртаць на сацыяльную абароненасць бедных пластоў насельніцтва.

У 2008 г. свет сутыкнуўся з цяжкім фінансавым крызісам. Яго маштабы часта параўноўваюць з «Вялікай дэпрэсіяй» 1929–1933 гг. Заходнія дзяржавы актывізавалі ўмяшанне ў эканоміку, аказалі вялікую фінансавую падтрымку прыватным прадпрыемствам, банкам. Яшчэ не былі цалкам пераадоленыя наступствы таго крызісу, як новы цяжкі ўдар па эканоміцы нанесла пандэмія COVID-19, якая пачалася ў 2020 г.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра наступствы пандэміі COVID-19 для эканомікі заходніх краін.

**3. Сучасныя праблемы еўраінтэграцыі.** Новы этап еўрапейскай інтэграцыі адкрыла падпісанне ў 1992 г. Маастрыхцкай дамовы.

Утварэнне Еўрапейскага

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### З Маастрыхцкай дамовы

Гэтай Дамовай высокія дагаворныя бакі зацвярджаюць паміж сабой Еўрапейскі саюз (далей называны «Саюз»), якому дзяржавы-члены надаюць кампетэнцыю для дасягнення сваіх агульных мэт.

1. Саюз ставіць за мэту садзейнічаць міру, сваім каштоўнасцям і дабрабыту сваіх народаў.

2. Саюз дае сваім грамадзянам прастору свабоды, бяспекі і правасуддзя без унутраных межаў, у рамках якой забяспечваецца свабоднае перамяшчэнне асоб ва ўзаемасувязі з адпаведнымі захадамі па пытаннях кантролю вонкавых межаў, давання прытулку, іміграцыі, а таксама прадухілення злачыннасці і барацьбы з гэтай з'явай.

3. Саюз стварае ўнутраны рынак. Ён імкнецца забяспечыць устойлівае развіццё Еўропы на аснове збалансаванага эканамічнага росту і стабільнасці цэн, наяўнасці ў высокай ступені канкурэнтаздольнай сацыяльнай рыначнай эканомікі, якая імкнецца да поўнай занятасці і сацыяльнага прагрэсу, а таксама высокі ўзровень аховы і паляпшэння якасці навакольнага асяроддзя. Ён спрыяе навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

4. Саюз стварае эканамічны і валютны саюз, грашовай адзінкай якога з'яўляецца еўра.

*1. Якія ўмовы дзейнасці Еўрапейскага саюза адлюстраваныя ў фрагменце дакумента?*

*2. Якія дзяржавы стаялі каля вытокаў яго стварэння? З якой мэтай гэтыя дзяржавы аб'ядналіся?*

*3. Якія аб'яднанні краін на постсавецкай прасторы маюць аналагічныя мэты?*

Маастрыхцкая дамова ўвайшла ў сілу 1 лістапада 1993 г. і прадугледжвала стварэнне на аснове існуючых еўрапейскіх супольнасцей Еўрапейскага саюза (ЕС). У яго рамках ствараўся адзіны рынак, ад 1999 г. адзіная валюта (еўра) пачала выкарыстоўвацца для міжнародных плацяжоў, а ад 2002 г. — для наяўных разлікаў у краінах ЕС. На новым этапе інтэграцыі еўрапейскія краіны значна больш увагі пачалі надаваць яе палітычнай частцы. Яны перайшлі да правядзення агульнай знешняй палітыкі.

**Пашырэнне Еўрапейскага саюза**

Пасля падпісання Маастрыхцкай дамовы працягнулася пашырэнне ЕС. Найбольш значнае павелічэнне колькасці яго ўдзельнікаў адбылося ў 2004 г. Сярод новых членаў ЕС былі Польшча, Літва і Латвія.

**Праблемы еўрапейскай інтэграцыі**

Інтэграцыйныя працэсы ў Еўропе сутыкаліся з пэўнымі праблемамі. Уступленне ў ЕС краін Усходняй Еўропы выклікала сярод насельніцтва «старых» членаў Саюза асцярогу наконт наплыву з усходу таннай рабочай сілы. Шмат хто быў незадаволены тым, што для падтрымкі слабейшых эканомік новых членаў ЕС патрабаваліся значныя сродкі.

> Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, колькі краін уваходзіць у ЕС сёння.

Найбольш моцныя антыінтэграцыйныя настроі традыцыйна існавалі ў Вялікабрытаніі. У 2016 г. у гэтай краіне адбыўся рэферэндум, на якім большасць тых, хто галасаваў, выказаліся за выхад з ЕС. У 2020 г. Вялікабрытанія спыніла членства ў ЕС.

**Эвалюцыя сацыялізму**

**4. Праблемы незалежнага развіцця і мадэрнізацыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.** З канца 1980-х гг. істотныя змены адбываліся ў большасці сацыялістычных краін Азіі. Кітай і В'етнам заявілі пра працяг будаўніцтва сацыялізму пры захаванні манаполіі камуністычных партый на ўладу, але пры гэтым правялі рэформы, вынікам якіх быў пераход да рыначнай эканомікі. Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка прытрымліваецца ранейшай мадэлі развіцця.

Краіны «сацыялістычнай арыентацыі» пасля распаду СССР, за рэдкім выключэннем, адмовіліся ад ранейшай мадэлі і сталі на капіталістычны шлях развіцця. У Лацінскай Амерыцы выбар на карысць сацыялізму захавала Куба.

**Падзенне аўтарытарных рэжымаў**

У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. у краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі стала відавочнай тэндэнцыя памяншэння колькасці аўтарытарных рэжымаў і павелічэння долі дэмакратычных дзяржаў. У Лацінскай Амерыцы ў гэты час абрынуліся ваенныя дыктатуры ў Аргенціне, Бразіліі, Чылі і іншых дзяржавах. Да ўлады прыйшлі палітычныя партыі, якія ў сваёй палітыцы рабілі стаўку на развіццё прыватнага прадпрымальніцтва і звялі дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі да мінімуму. Гэта прывяло да імклівага росту разрыву паміж даходамі багатых і бедных, падзення ўзроўню жыцця значнай часткі насельніцтва. Вынікам была перамога на выбарах у шэрагу краін Лацінскай Амерыкі ў канцы XX — пачатку XXI ст. палітычных сіл, якія абвясцілі сваёй мэтай пабудову сацыялізму. У прыватнасці, такую палітыку праводзіў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес. Ён абвясціў пабудову гуманнага сацыялізму, пры якім інтарэсы грамадзян важнейшыя за інтарэсы карпарацый.

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж памяншэннем дзяржаўнага рэгулявання эканомікі і ростам разрыву паміж даходамі багатых і бедных колаў насельніцтва.

У Азіі станаўленне дэмакратычных рэжымаў адбывалася перш за ўсё ў краінах, якія дасягнулі поспехаў у мадэрнізацыі эканомікі. У Рэспубліцы Карэя ў другой палове 1980-х гг. абрынулася ваенная дыктатура і ўсталявалася дэмакратычная сістэма. Напрыканцы 1990-х гг. была ліквідавана аўтарытарная дыктатура ў Інданезіі.

На афрыканскім кантыненце захаваліся пераважна аўтарытарныя рэжымы. Для краін гэтага рэгіёна ў канцы XX — пачатку XXI ст. па-ранейшаму былі характэрныя палітычная нестабільнасць, шматлікія міжэтнічныя і міждзяржаўныя канфлікты. Найбуйнейшым сярод іх была Другая кангалезская, або

Вялікая афрыканская, вайна 1998–2003 гг. Яна пачалася як унутраны канфлікт у Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, пасля ў вайну ўцягнуўся шэраг афрыканскіх дзяржаў. Па колькасці ахвяр — 5,4 млн чалавек — яна стала самым буйны́м ваенным канфліктам у свеце пасля Другой сусветнай вайны.

Новыя індустрыяльныя краіны

Паводле ўзроўню эканамічнага развіцця сярод краін «трэцяга свету» напрыканцы XX ст. сфарміравалася група *новых індустрыяльных дзяржаў*. Гэта Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Тайланд, Малайзія і інш. Яны ў значнай ступені пераадолелі адставанне ад эканамічна развітых краін Захаду, пачалі ажыццяўляць пераход да постіндустрыяльнага грамадства.

Аднак большасць краін, якія развіваліся, па-ранейшаму заставаліся эканамічна адсталымі. Яны не маглі вырашыць праблему беднасці большай часткі насельніцтва. Асабліва складанае было становішча ў Афрыцы, дзе не з'явілася ніводнай новай індустрыяльнай дзяржавы. Адной з прычын нарастання эканамічных цяжкасцей і нізкага ўзроўню жыцця быў імклівы рост насельніцтва ў большасці краін, якія развіваліся.

**5. Неакаланіялізм.** *Дэкаланізацыя* ў XX ст. прывяла да фармальнага вызвалення многіх дзяржаў. Аднак па сутнасці прамое каланіяльнае панаванне было заменена на новыя формы эканамічнага, палітычнага і культурнага кантролю Захаду над многімі краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Краіны «трэцяга свету» і пасля падзення каланіялізму захавалі залежнасць ад найбуйнейшых дзяржаў Захаду ў розных галінах.

**Неакаланіялізм** — форма залежнасці краін, што развіваюцца, ад былых каланіяльных дзяржаў і буйны́х міжнародных карпарацый, якая захоўваецца пасля атрымання палітычнай незалежнасці.

**Неакаланіялізм** захоўвае няроўнасць, ускладняе развіццё краін, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці. Барацьба супраць неакаланіялізму застаецца ключавым выклікам для большасці краін сучаснага свету.

**НЕАКАЛАНІЯЛІЗМ**

**Фінансавая залежнасць**

Міжнародныя фінансавыя інстытуты (Міжнародны валютны фонд, Сусветны банк) выдаюць крэдыты на ўмовах, якія абмяжоўваюць эканамічную самастойнасць краін-даўжнікоў

**Палітычны ўплыў**

Развітыя краіны аказваюць ціск на палітычнае кіраўніцтва краін, якія развіваюцца, выкарыстоўваючы дыпламатычныя рычагі, санкцыі, падтрымку лаяльных рэжымаў, прамое ўмяшанне ва ўнутраныя справы для забеспячэння сваіх інтарэсаў («каляровыя рэвалюцыі»)

**Кантроль над прыроднымі рэсурсамі**

Буйныя ТНК здабываюць рэсурсы ў краінах, якія развіваюцца, мінімальна ўплываючы на мясцовую эканоміку, і часцяком чыняць шкоду экалогіі

**Эканамічная залежнасць**

Краіны, якія развіваюцца, арыентаваныя на экспарт сыравіны і імпарт прамысловых тавараў, што ўзмацняе іх уразлівасць перад ваганнямі цэн на сусветным рынку

**Культурны ўплыў**

Дамінаванне заходняй культуры, мовы і каштоўнасцей, што аслабляе нацыянальную ідэнтычнасць

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце кожную праяву палітыкі неакаланіялізму фактамі.

**6. Краіны «глабальнага Поўдня» і іх роля ў сучасным свеце.** Тэрмін «глабальны Поўдзень» пачалі выкарыстоўваць у 1980-х гг. для абазначэння краін «трэцяга свету», якія знаходзяцца пераважна ў паўднёвай частцы свету. Ён супрацьпастаўляўся «глабальнай Поўначы», якая ўключала развітыя краіны.

«Глабальны Поўдзень» ахоплівае рэгіёны Лацінскай Амерыкі, Афрыкі і Азіі (за выключэннем Японіі, Рэспублікі Карэя, Ізраіля). Гэта вобласці з высокімі паказчыкамі беднасці, няроўнасці і палітычнай нестабільнасці, але разам з тым там растуць эканамічныя магчымасці. Краіны «глабальнага Поўдня» робяцца цэнтрамі росту дзякуючы вялікай колькасці маладога насельніцтва і прыродных рэсурсаў.

Да найбольш уплывовых краін «глабальнага Поўдня» адносяць Кітай, Індыю, Іран, Інданезію, ААЭ,

**Значэнне тэрміну «глабальны Поўдзень»**




**Паспяховыя краіны «глабальнага Поўдня»**

ПАР, Бразілію. У сучасным свеце значэнне краін «глабальнага Поўдня» расце. Гэта звязана з эканамічнымі поспехамі шэрагу з іх. Так, Кітай і Індыя ўваходзяць у пяцёрку краін свету з найбуйнейшымі эканомікамі іператварыліся ўжо ў значныя цэнтры сілы на міжнароднай арэне. КНР выкарыстоўвае экспартаарыентаваную мадэль эканомікі, ажыццяўляе маштабныя інвестыцыі ў інфраструктуру і тэхналогіі; актыўна ўдзельнічае ў міжнароднай палітыцы, прасоўвае ініцыятывы, скіраваныя на супрацоўніцтва з іншымі краінамі «глабальнага Поўдня». Дзяржавы «глабальнага Поўдня» імкнуцца да пераадолення няроўнасці ў сусветным гандлі, выступаюць за стварэнне больш справядлівай сістэмы міжнародных адносін, у межах якой больш улічваліся б іх інтарэсы. Яны надаюць важнае значэнне наладжванню супрацоўніцтва з Расіяй, прыкладам чаго можа служыць дзейнасць БРІКС.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*1. Што такое ВУП?*

*2. Прааналізуйце рэйтынг дзяржаў, якія паказалі найбольшыя тэмпы росту ВУП у 2024 г. Якія з іх належаць да «глабальнай Поўначы», а якія — да «глабальнага Поўдня»?*

*3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія фактары забяспечваюць краінам «глабальнага Поўдня» хуткі рост ВУП.*

*4. З чым, на ваш погляд, звязаныя перспектывы эканамічнага развіцця дзяржаў «глабальнага Поўдня»? Сваю думку аргументуйце.*

*У канцы XX — першай чвэрці XXI ст. у краінах Захаду адбыліся змены ў палітычным і эканамічным жыцці: зблізіліся ідэалогіі традыцыйных партый, узмацніўся ўплыў папулісцкіх партый, зацвердзілася неакансерватыўная мадэль эканамічнага развіцця, далейшае развіццё атрымала еўрапейская інтэграцыя. У краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі працягнуўся працэс мадэрнізацыі, вынікам якога стаў рост ролі гэтых краін у свеце.*

**калі ў свеце…**

2013 г. — Кітай ініцыяваў праект «Адзін пояс — адзін шлях»

**на тэрыторыі Беларусі…**

2014 г. — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падпісаў Указ «Аб дзейнасці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку „Індустрыяльны парк «Вялікі камень»“»

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія змены адбыліся ў палітычным жыцці краін Захаду ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.?
2. Якія прычыны пераходу краін Захаду да неакансерватыўнай мадэлі эканамічнага развіцця? Ахарактарызуйце яе прыкметы.
3. З якімі праблемамі сутыкнулася еўрапейская інтэграцыя ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.?
4. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі палітыкі неакаланіялізму.
5. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначце асноўныя кірункі мадэрнізацыі краін «глабальнага Поўдня» ў канцы XX — пачатку першай чвэрці XXI ст. Ахарактарызуйце яе асноўныя вынікі.